# АФГАНЕЦ СТВАРАЕ ХУТАР

Нядаўна Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання С. Шапіра паведаміў, што сёлета ў кожным рэгіёне Беларусі плануецца стварыць па некалькі хутароў. Мінсельгасхарч гарантуе выдзяленне зямельных участкаў тым, хто жадае жыць на хутары і весці хатнюю гаспадарку. Будзе аказана садзеянне уладальнікам хутарскіх гаспадарак у будаўніцтве жылля, пракладцы ліній электраперадач.

– У сельскай мясцовасці, – адзначае Віталь Аркадзьевіч Лапкоўскі, – павінны быць розныя формы гаспадарання, у тым ліку і хутарскія.

Хутарам завецца аднадворная сельская сяліба, якая месціцца на адасобленым участку. Хутар, як сведчыць гісторыя, вядомы з даўніх часоў у многіх земляробчых народаў. У сібіракоў ён заімка, у прыбалтаў – мыза, у палякаў – фальварак, у беларусаў – сяліба, сяліцьба.

На заходнебеларускіх абшарах такі варыянт гаспаспадарання пачаў складвацца ў XVI стагоддзі. У XIX хутарамі-засценкамі называліся фальваркі шляхціцаў-арандатараў, аднадворцаў. А сялянскія з’явіліся ў другой яго палове. Значна пашыралася хутарскае рассяленне ў беларускіх губернях пад уплывам перасяленцаў з Прыбалтыкі. У 1905 годзе ў Віцебскай было болей за 5 тысяч хутароў. Яны лічыліся сведчаннем заможнасці іх уладальнікаў.

У 1925-ым ажно чвэрць сялянскіх гаспадарак Беларусі месцілася на хутарах. Альтэрнатывай ім з’явіліся калгасы і саўгасы. А праз чатыры гады хутаранскі побыт увогуле апынуўся пад забаронай. На землях Заходняй Беларусі, у тым ліку ў шасці сённяшніх раёнах Віцебшчыны, хутары «за польскім часам» пашыраліся да 1939 года. Пасля ж згодна з пастановай савецкага ўрада «Аб мерах па ахове грамадскіх земляў калгасаў ад разбазарвання» ўсе яны да верасня 1940-га падлягалі ссяленню ў пасёлкі.

Такі экскурс у гісторыю зрабілі з Віталём Аркадзьевічам і яго маці Софіяй Пятроўнай, якой 82 гады.

Сям’я Лапкоўскіх жыла ў Пустошцы, цяпер там засталося чатыры хаты і некалькі насельнікаў. У сям’і было пяцёра дзяцей. Так сталася, што рана пайшоў з жыцця бацька, і ўсе клопаты леглі на плечы Софіі Пятроўны.

Не адразу Віталь пачаў займацца фермерствам. Пасля службы ў арміі, дарэчы, два гады правёў у Афганістане, вярнуўся ў калгас «Рассвет». Працаваў вадзіцелем, механізатарам, потым вывучыўся на кранаўшчыка. Праз нейкі час перайшоў у лясніцтва. Прыкладна пяць гадоў адбыў на пасадзе лесніка. У 1999-ым прыняў рашэнне заняцца

фермерствам. Спецыялізацыя – жывёлагадоўля. Летась рэалізаваў дзяржаве прыкладна 7 тон малака. А гэта асноўны даход.

– Землеўладанні ў 20 га па дарозе да вёскі Стары Пагост, – расказвае Віталь Аркадзьевіч. – Калісьці там былі кусты, раслі асобныя дрэвы. Потым участак расчысцілі. Гэтай зямлёй і карыстаюся. Узвёў дом, праўда, не ўсе работы яшчэ выкананы. Мяркую пабудаваць для жывёлы хлявы. Пэўныя работы ўжо выкананы, таму ў летні час менавіта там знаходзіцца статак пасля паствы. Толькі на зіму перагнаў ў Новы Пагост, дзе цяпер жыву з сям’ёй. Разам са мной і маці.

Утрымліваць гаспадарку дапамагае жонка, якая працуе настаўніцай хіміі і біялогіі Новапагосцкай СШ, а таксама матуля. Не цураюцца працы сыны: Дзіма ходзіць у чацвёрты клас, а Саша – у сёмы. Яны з ахвотай дапамагаюць бацьку, любяць жывёлу. У старэйшага з Лапкоўскіх вялікія спадзяванні на іх, бо жыццё на хутары патрабуе рабочых рук.

– Асабліва патрэбны яны, – заўважае Віталь Аркадзьевіч, – у сенакосны час. За кароткі перыяд трэба назапасіць кармоў на зіму. Кожная мінута на ўліку.

Так, у фермера ёсць старэнькі трактар МТЗ-80 з навяснымі прыладамі, грузавая і легкавая машыны.

Былы афганец спадзяецца, што задуманае ўдасца рэалізаваць, бо адносіны дзяржавы да фермерства мяняюцца ў лепшы бок.

– Пабачым, – коратка падвёў вынікі размовы на гэту тэму субяседнік.

Успомнілі вайну ўАфганістане.

– 9 лютага 1986 года трапіў у гэту краіну, – расказвае В. А. Лапкоўскі. – Служыць давялося ў 395-ым мотастралковым палку.

Што ведаў пра гэту краіну малады салдат? Зусім няшмат. Красавіцкая рэвалюцыя, якая павінна была ўсталяваць у ДРА сацыялістычны лад жыцця і дэмакратыю, на самой справе не была пазбаўлена перагібаў, несла рэпрэсіі і разбурэнні. Рэвалюцыянеры хацелі пабудаваць сацыялізм у краіне, дзе доўгі час кіравала ісламскае духавенства, дзе захаваліся родаплемянныя адносіны. У выніку ўзнік апазіцыйны рух, які на поўную сілу супрацiўляўся ўсталяванню сацыялізму. Урадавым войскам неабходна была дапамога, якую і аказаў Савецкі Саюз.

– Дарэчы, у той час вялося шмат спрэчак вакол правамернасці ўводу ў Афганістан савецкіх войскаў, не сціхаюць яны і сёння, – заўважае субяседнік. – Думаецца, гэты крок нельга ацэньваць адназначна. Асуджаць лёгка. Армія на тэрыторыі Афганістана ўпершыню сутыкнулася з міжнародным тэрарызмам. Далёка не ўсе так званыя душманы змагаліся «за ідэю» – многія ішлі ў банды, спакусіўшыся магчымасцю лёгкай здабычы.

Бандфарміраванні шчодра фінансаваліся спецслужбамі ЗША, Саўдаўскай Аравіі, Пакістана і іншых краін.

Віталь разам са сваімі сябрамі на БТРах суправаджаў калоны, якія накіроўваліся ў Кундуз, Кабул, іншыя месцы. Часта здараліся напады, даводзілася абараняцца.

Праз нейкі час Віталя пераводзяць у роту сувязі, дзе ён вазіў камандзіра палка.

– Канешне, жылі ў пастаянным напружанні, – успамінае былы афганец. – Суцэльнага фронта не было. У пачатку 80-х душманы, як правіла, мелі буйныя фармiразанні – і савецкім войскам было прасцей. Можна было прымяняць супраць іх усю моц тэхнікі, зброі, авіяцыі. Пазней яны зразумелі гэта і пачалі дзейнічаць дробнымі групкамі – хаваліся ў камянях, норах, перапаўзалі з гары на гару. Бандфарміраванні пастаянна мелі падтрымку з-за мяжы. Асноўныя спецшколы знаходзіліся на тэрыторыі Пакістана.

Па ўсім відаць, былы афганец не любіць вяртацца ў тыя падзеі, адгаворваўся коратка, маўляў, служба як служба. Заўважыў, што вайна мабілізоўвала людзей. Там жыццё кожнага залежыла ад усіх астатніх.

– Дзякаваць Богу, што бяда не зачапіла мяне, – разважае Віталь. – Адслужыў годна, бо нас паслала Айчына абараняць дзяржаўныя інтарэсы. Роўна два гады правёў у Афганістане. А на дзень нараджэння, 16 лютага 1989 года, быў дома ў матулі. Вось такі падарунак лесу.

Зразумела, што маці чакала сынка. У размове яна сказала, што ведала, дзе служыць Віталь. Праўда, па пісьмах цяжка было здагадацца, як яму ў далёкай краіне. Пісаў пра надвор’е, што ўсё нармальна.

З 1992 года Віталь Аркадзьевіч Лапкоўскі жыве ў Новым Пагосце. Адкупіў у калгаса дамок, штосьці пераўладкаваў.

Планы на будучыню вызначаны. Засталося іх ажыццявіць. Няхай у былога салдата ўсё атрымаецца, а жыцце на хутары прынясе шмат радасных хвілін.

***Л. Касаты***

*Міёрскія навіны. — 2009. — 31 студз. — С. 3.*